УДК 811.161.3:378

І. У. Капцюг, дац., канд. філал. навук (ВА РБ, г. Мінск)

# РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ КУРСАНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Асноўная мэта дзейнасці выкладчыка ВНУ – стварэнне ўмоў для развіцця творчай асобы, якая здольна вырашаць складаныя пытанні не па шаблону, не стандартна, таму што ад гэтага залежыць поспех у далейшым прафесійным і асабістым жыцці. Любыя заняткі па беларускай мове можна зрабіць творчымі, дзе з дапамогай імправізацыі і пошуку новых спосабаў узаемадзеяння будзе дасягнуты лепшы вынік, чым на звычайных занятках. Гэтаму садзейнічаюць педагагічныя метады і тэхналогіі.

Тэхналогія калектыўнай творчай дзейнасці (далей – КТД) з’яўляецца адной з педагагічных тэхналогій, якія падрабязна апісаны ў літаратуры [1; 2; 3] і шырока выкарыстоўваюцца ў педагагічнай практыцы. Тэхналогія КТД цалкам адпавядае прыкметам тэхналогій асобасна арыентаванага педагагічнага працэсу і будуецца на яго прынцыпах. Растлумачым назву тэхналогіі: *калектыўная* – плануецца, арганізуецца, ажыццяўляецца, абмяркоўваецца выхаванцамі і педагогамі ў агульнай сумеснай дзейнасці па рэалізацыі агульных і індывідуальных мэтаў; *творчая* – ажыццяўляецца не па шаблону і стандарту, а выступае ў новых варыянтах, падразумявае імправізацыю удзельнікаў, пошук новых нетрадыцыйных спосабаў узаемадзеяння; *дзейнасць* – тэхналогія накіравана на актыўнае пераўтварэнне рэчаіснасці, сябе, свайго ўзаемадзеяння з удзельнікамі педагагічнага працэсу; у яе аснове ляжыць разнастайнасць і змена відаў дзейнасці ў педагагічным працэсе, дзейнасны падыход да яго арганізацыі.

Згодна з С.С. Кашлевым, тэхналогія КТД прадугледжвае тры наступныя асноўныя этапы: 1) падрыхтоўка і арганізацыя мерапрыемства; 2) правядзенне; 3) аналіз, рэфлексія справы.

Дадзім характарыстыку кожнаму этапу.

**Першы этап.** Падрыхтоўка і арганізацыя мерапрыемства. Рэалізацыя дадзенага этапу прадугледжвае наступную паслядоўнасць узаемадзеяння ўдзельнікаў педагагічнага працэсу.

1. Правядзенне стартавай гутаркі. Выкладчык абмяркоўвае з курсантамі пытанні: “Што лепш зрабіць?”; “Калі?”; “Дзе праводзіць?”; “Хто будзе ўдзельнічаць?” і г. д. Педагог прапануе навучэнцам якое-небудзь заданне і высвятляе стаўленне курсантаў да яго арганізацыі і правядзення. Удзельнікі педагагічнага ўзаемадзеяння разважаюць аб канструктыўнасці задання для сябе і спосабах яго арганізацыі.

2. Стварэнне мікрагруп (творчых груп). Узвод дзеліцца на мікрагрупы колькасцю 5–7 чалавек. Варыянты падзелу на мікрагрупы:

па ўменнях, па жаданні (хто з кім хоча), па інтарэсах. Далей вызначаецца кіраўнік мікрагрупы.

3. Абмеркаванне пытання ў мікрагрупах. Камунікацыя арганізуецца па па ланцужку. Магчымасць выказацца прадастаўляецца кожнаму ўдзельніку мікрагрупы. Абмяркоўваюцца мэтазгоднасць задання для ўдзельнікаў мікрагрупы, спосабы яго падрыхтоўкі і правядзення, роля мікрагрупы. Калі групы не вылучаюць сваіх прапаноў (не хочуць, не ведаюць), то выкладчык выкарыстоўвае розныя прыёмы актывізацыі дзейнасці групы, напрыклад: падказкі (спытайце ў кагосьці, паглядзіце гэтую кнігу, успомніце аб чымсьці і г. д.); дамоўленасць з асобнымі членамі групы; анансаванне дзейнасці (прагаварыць з курсантамі прыкладны план выканання справы); эмацыйнае заахвочванне (кампліменты, адабрэнне, пахвала); прапанова выбару з некалькіх варыянтаў; прамы ўдзел педагога ў працы мікрагрупы; сюрпрызы (выкананне мікрагрупай часткі агульнай справы па сакрэце ад іншых); дапамога парадай; давер адказным даручэннем (“Толькі вы можаце гэта зрабіць вельмі добра”); зварот з просьбай аб дапамозе; канструктыўная крытыка і інш.

4. Правядзенне старту. На старт збіраюцца ўсе мікрагрупы. Ідзе абмеркаванне формы, зместу мерапрыемства, спосабаў яго падрыхтоўкі і правядзення. Кожная мікрагрупа прадастаўляе свае прапановы па арганізацыі і правядзенні справы. Старт заканчаецца стварэннем Савета. Поспех шмат у чым залежыць ад вядучага (ім можа быць як выкладчык, так і хто-небудзь з навучэнцаў).

5. Стварэнне Савета. У склад Савета кожная мікрагрупа дэлегуе па адным чалавеку (гэта можа быць кіраўнік мікрагрупы). Савет фарміруе сцэнарый справы, выдае заданні мікрагрупам. Заданні могуць быць самымі разнастайнымі, напрыклад: афармленне залы, запрашэнне гасцей, правядзенне інтэрактыўнай гульні, падрыхтоўка і дэманстрацыя пэўных уменняў і г. д. Узначальваць Савет можа педагог (ці хто-небудзь з навучэнцаў), які арганізуе камунікацыю, узаемадзеянне паміж прадстаўнікамі мікрагруп, карэкціруе абмеркаванне справы, вылучае ідэі, стварае сітуацыю поспеху ў дзейнасці для ўдзельнікаў Савета.

6. Выкананне заданняў мікрагрупамі.

У залежнасці ад характару і арганізацыйных асаблівасцей справы на выкананне задання мікрагрупам прапануецца ад 15–40 хвілін у залежнасці ад цяжкасці задання. Мікрагрупы абмяркоўваюць атрыманае ад Савета заданне і арганізуюць працу па яго выкананні. Рашэнне па размеркаванні заданняў у мікрагрупе прымаюць усе яе члены, пры гэтым улічваюцца інтарэсы, патрэбы, індывідуальныя асаблівасці ўсіх удзельнікаў.

**Другі этап.** Правядзенне мерапрыемства. Асноўнымі прынцыпамі рэалізацыі мерапрыемства з'яўляюцца: арганізацыя творчай задумы, свабода выбару, імправізацыя, стварэнне сітуацыі поспеху і інш. Правядзенне справы з'яўляецца вынікам усёй падрыхтоўчай працы мікрагруп і Савета. Пазіцыя педагога падчас правядзення справы можа быць рознай: прамое кіраўніцтва, удзел у працы журы, вядзенне адной з частак мерапрыемства, выкананне ролі "выратавальнай каманды", калі нешта не атрымліваецца. Агульная тэндэнцыя ўзаемадзеяння педагога і навучэнцаў такая: чым больш у курсантаў вопыт творчай дзейнасці, тым больш выкладчык адыходзіць ад пазіцыі арганізатара, спыняецца на рэгуляванні настрою, узаемаразумення, інтэракцыі, стварэння сітуацыі поспеху.

**Трэці этап.** Рэфлексія мерапрыемства. Аналіз патрэбен для таго, каб кожны ўдзельнік усвядоміў для сябе значнасць справы. Рэфлексія ажыццяўляецца спачатку ў мікрагрупах, а затым на агульным зборы калектыву. Асноўнымі пытаннямі для абмеркавання, калектыўнага аналізу з'яўляюцца наступныя: 1. Што было добра на занятках? Чаму? 2. Што не ўдалося ажыццявіць? Чаму? 3. Што трэба ўлічыць на будучыню? 4. Ці была карысць ад справы табе, іншым? 5. Ці была група творчай, дзейснай? 6. Што больш за ўсё спадабалася ў мерапрыемстве? 7. Што было галоўным адкрыццём мерапрыемства для цябе? 8. Як можаш ацаніць яго? 9. Што хацеў бы пажадаць сабе і іншым? Калектыўны аналіз і рэфлексія мерапрыемства – гэта не толькі завяршэнне КТД, але і працяг, паглыбленне яго ўплыву на ўдзельнікаў педагагічнага працэсу.

## ЛІТАРАТУРА


1. Евсин, Е. А. Развитие творческих способностей личности в условиях непрерывного профессионального образования (обоснование и опыт) / Е. А. Евсин. – Фундаментальные исследования. – 2005. – № 8. – С. 72–75.
2. Кашлев, С. С. Современные технологии педагогического процесса: пособие для педагогов / С. С. Кашлев. – Минск: Университетское, 2000. – 95 с.
3. Педагогические игротехники: копилка методов и упражнений / Л. С. Кожуховская [и др.] ; под общ. ред. Л. С. Кожуховской. – Минск : Изд. центр БГУ, 2010. – 233 с.